# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Беларускі Дзяржаўны Універсітэт 1921

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта, 30 верасня 1999 года, чацвер, № 14 (1806)


ГОСЦІ Ў ХАТУ

## УНІВЕРСІТЭТЫ НА МЯЖЫ СТАГОДДЗЯЎ

З'езд Еўразійскай асацыяцыі універсітэтаў адкрыўся 24 верасня ў будынку рэктарата БДУ. Адкрыццё прайшло ва ўрачыстай абстаноўцы, пад гімн "Гаўдэамус". Гэтая міжнародная няўрадавая арганізацыя аб'ядноўвае універсітэты былога СССР і існуе з 1989 года. Сярод яе заснавальнікаў 20 універсітэтаў, а зараз ЕАУ аб'ядноўвае



59 класічных універсітэтаў краін СНД і Латвіі. Асноўнымі задачамі асацыяцыі з'яўляецца захаванне адзінай адукацыйнай прасторы краін рэгіёну праз арганізацыю міжнароднага супрацоўніцтва універсітэтаў — членаў асацыяцыі, а таксама прыцягванне фінансавых і



матэрыяльных рэсурсаў для развіцця сістэмы падрыхтоўкі спецыялістаў з універсітэцкай адукацыяй. ЕАУ вырашае таксама пытанні сацыяльнага развіцця універсітэтаў, накіраваныя на паляпшэнне становішча студэнтаў, аспірантаў, выкладчыкаў і інш.

Апошні раз членаў асацыяцыі гасцінна прымаў у сваіх сценах МДУ імя М.В. Ламаносава ў 1997 годзе.

З'езд адкрыўся прывітальнай



прамовай рэктара БДУ прафесара А.У. Казуліна, які прадставіў слова прэзідэнту асацыяцыі рэктару МДУ В.А. Садоўнічаму.

На пленарным пасяджэнні з дакладам "Еўразійская асацыяцыя універсітэтаў на мяжы стагоддзяў" выступіў рэктар МДУ В.А. Садоўнічы. Даклад "Развіццё БДУ на сучасным этапе" прадставіў рэктар Белдзяржуніверсітэта А.У. Казулін. Апрача таго, былі заслуханы даклады "Аб асноўных накірунках узаемадзеяння Еўразійскай асацыяцыі з Міжпарламенцкай асамблеяй СНД", "Аб узаемадзеянні з Саветам па супрацоўніцтве ў галіне адукацыі дзяржаў — удзельніц СНД", "Аб супрацоўніцтве універсітэтаў краін СНД на мяжы стагоддзяў".

У перапынку пленарнага пасяджэння дэлегатаў з'езда прыняў у сваёй рэзідэнцыі Прэзідэнт Беларусі А.Р. Лукашэнка, які прадставіў магчымасць правядзення з'езда ў БДУ і праявіў увагу да яго працы. Удзельнікі з'езда выказалі кіраўніку дзяржавы сваю шчырую ўдзячнасць.

На з'ездзе была выказана прапанова стварэння Міжнароднай праграмы развіцця адукацыі і універсітэцкай навукі ў краінах СНД, а таксама было прапанавана стварыць Міжнародны фонд асацыяцыі. Савету асацыяцыі было даручана падрыхтаваць "Зварот VIII з'езда ЕАУ да кіраўнікоў дзяржаў і урадаў краін СНД" дзеля падтрымкі універсітэцкай адукацыі і навукі.

Сёлета ў гэтую прадстаўнічую асацыяцыю былі прыняты 9 універсітэтаў у якасці сапраўдных членаў і 2 — у якасці асацыіраваных.

Які універсітэт адчыніць свае дзверы для наступнага з'езда асацыяцыі ў 2001 годзе — невядома. А за сёлетнюю цудоўную падрыхтоўку і арганізацыю пасяджэнняў з'езда члены ЕАУ выказалі шчырую падзяку рэктару і супрацоўнікам БДУ, а таксама членам аргкамітэта.

*Валерыя ЛУЦКОВА*

*Фотаздымкі Генадзя КРАСКОЎСКАГА*

АБ'ЯВЫ

### Рэктарат Беларускага дзяржаўнага універсітэта

аб'яўляе конкурс

на замяшчэнне пасад:

- **Загадчыкаў кафедраў:** інтэлектуальных сістэм, мікрабіялогіі, менеджменту, банкаўскай і фінансавай эканомікі, тэарэтычнага і славянскага мовазнаўства, беларускай літаратуры XX стагоддзя, гісторыі Беларусі новага і найноўшага часу, гісторыі новага і найноўшага часу;
- **Прафесараў кафедраў:** фізічнай оптыкі, тэорыі літаратуры, беларускай літаратуры XX стагоддзя, гісторыі Беларусі новага і найноўшага часу;
- **Дацэнтаў кафедраў:** атамнай фізікі і фізічнай інфарматыкі, фізікі, тэарэтычнай механікі і робататэхнікі, дыферэнцыяльных ураўненняў, ураўненняў матэматычнай фізікі, неарганічнай хіміі, агульнай хіміі і методыкі выкладання хіміі, арганічнай хіміі і хіміі ВМЗ, радыяцыйнай хіміі і хімічнай тэхналогіі, эканамічнай геаграфіі Беларусі і дзяржаў Садружнасці, глебазнаўства і геалогіі, геаграфічнай экалогіі, батанікі, мікрабіялогіі, генетыкі і біятэхналогіі, эканамічных навук, эканамічнай тэорыі, сучаснай беларускай мовы, рускай літаратуры, прыкладной лінгвістыкі, беларускай літаратуры XX стагоддзя, славянскіх літаратур, англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў, матэматычнай фізікі, вылічальнай матэматыкі, вышэйшай матэматыкі, тэхналогіі праграміравання, матэматычнага забеспячэння ЭВМ;
- **Старшых выкладчыкаў кафедраў:** вышэйшай алгебры, сучаснай беларускай мовы, міжнародных адносін, міжнародных эканамічных адносін, педагогікі і праблем развіцця адукацыі, англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў;
- **Выкладчыкаў кафедраў:** глебазнаўства і геалогіі, славянскіх літаратур, міжнароднага турызму, міжнароднага права;
- **Асістэнтаў кафедраў:** аналітычнай хіміі, неарганічнай хіміі, батанікі.

Тэрмін конкурсу — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы. Адрас: *220050, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5-а, Белдзяржуніверсітэт, упраўленне кадраў, тэл. 226-59-39.*

АКТУАЛЬНА

# НАВУЧАННЕ ЗА МЯЖОЙ

Адукацыя заўсёды адыгрывала важную ролю ў грамадстве, а тым больш зараз — на парозе XXI стагоддзя. Сёння вельмі актуальнымі сталі розныя адукацыйныя праграмы за мяжой, якія дазваляюць набрацца новых ведаў, вывучыць замежную мову дый проста пазнаёміцца з цікавымі людзьмі.

А каб атрымаць больш падрабязную інфармацыю пра замежныя адукацыйныя праграмы, мы падышлі да старшага інспектара Упраўлення міжнародных сувязей Д.А. Дрожжы.

**— Якія замежныя паездкі плануюцца ў гэтым годзе?**

— Ад Міністэрства замежных сувязей да нас прыйшоў ліст, у якім універсітэт Атавы прапануе арганізаваць абмен выкладчыкамі і студэнтамі па навучальнай праграме, дзе прапануецца вывучэнне англійскай, нямецкай і французскай моў. Гэта праграма плануецца на 12 тыдняў. Цікава, што канадскі бок вельмі зацікаўлены, каб іх студэнты вучыліся ў нас.

**— А што вы плануеце яшчэ?**

— Па Інтэрнэце да нас дайшлі звесткі аб праграме адукацыйных абменаў, якія распаўсюджвае пасольства ЗША і інфармацыйнае агенцтва ЗША па двух напрамках: першы — для навукоўцаў гуманітарных і грамадскіх навук, а другі — па актуальных пытаннях у рамках акта падтрымання свабоды. Прыняць удзел у гэтых мерапрыемствах могуць грамадзяне Беларусі з вышэйшай адукацыяй, якія працуюць над гэтымі праблемамі каля трох гадоў. Узрост павінен быць ад 25 да 55 гадоў. Таксама неабходна веданне англійскай мовы. Гэтая праграма паўтараецца кожны год, і амерыканскі бок аказвае поўную фінансавую дапамогу.

**— Дзякую за адказы!**

А вы, дарагія чытачы, выбірайце шлях сваёй далейшай адукацыі.

*Ксенія МАСАЛЁВА*

САКРЭТ ФІРМЫ

# АДУКАЦЫЯ ШЫРОКАГА ПРОФІЛЮ

Сёння ў расійскія ВНУ паступаюць толькі 30 працэнтаў выпускнікоў школ. Гэты паказчык насцярожвае, бо са змяншэннем спажыўцоў ведаў змяншаецца і колькасць будучых спецыялістаў. Праблема адукацыі заўжды вострa стаяла ва ўсіх цывілізаваных краінах, але сёння нават высокакваліфікаваныя спецыялісты часам застаюцца незапатрабаванымі ў сувязі з вузкапрофільнай адукацыяй.

Гэтай праблемай даўно ўжо займаюцца ў ЗША. Там асноўнай задачай 2000 года з'яўляецца павелічэнне колькасці спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй на 68 працэнтаў. У Расіі ж (па звестках даследаванняў, якія праводзіліся ў рамках ЕС) гэтая патрэба ўзрасце толькі на 5 тысяч чалавек, што складзе 1,2 працэнта.

Аднак Міжнародная акадэмія навук вышэйшай школы РФ і краін СНД ужо распрацавала такі праект гуманітарна-тэхнічнага універсітэта, які мусіць аб'яднаць у сабе два віды адукацыі: прыродазнаўчую і гуманітарную. Яго выпускнікі будуць вырашаць задачы, у якіх неабходны сінтэз падыходаў, характэрных для дзвюх навуковых сістэм. Іншымі словамі, гэта будзе універсітэт адзінай культуры чалавецтва, накіраваны на падрыхтоўку спецыялістаў шырокага профілю.

Хочацца верыць, што гэты праект у хуткім часе ўкараніцца ў сістэме расійскай адукацыі, пасля чаго, магчыма, і ў нас у Беларусі пераймуць добры прыклад. Хаця неабходна адзначыць, што ў БДУ ўжо існуе ініцыятыўная група, што распрацавала праект такога падраздзялення, якое б спецыяльна рыхтавала выпускнікоў для ўпраўленчай дзейнасці. Аўтарам гэтай ідэі з'яўляецца загадчык НДЛ інфармацыйных сістэм Ю.В. Пазняк, з дапамогай якога і быў падрыхтаваны гэты матэрыял.

*Валерыя ЛУЦКОВА*

ЛЕТА-99

# СУСТРЭЧА Ў "КАКТЭБЕЛІ"

Напрыканцы жніўня ў Крыме на базе дзіцячага аздараўленчага лагера (ДАЛ) "Кактэбель" прайшла II Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Актуальныя праблемы стварэння, функцыянавання і развіцця сістэмы сацыяльна-педагагічнай дзейнасці ў дзіцячым аздараўленчым лагеры ва ўмовах пераходу да інфармацыйнага грамадства". У ёй прымалі ўдзел навукоўцы і арганізатары-практыкі дзіцячага адпачынку з Беларусі, Расіі, Украіны. Прадстаўнікі Казахстана, на жаль, прысутнічаць не змаглі, але даслалі свае матэрыялы. Арганізатарамі канферэнцыі выступілі Белдзяржуніверсітэт, Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт і дзіцячы аздараўленчы лагер "Кактэбель" (п. Курортнае, Крым). Дарэчы будзе заначыць, што ўжо некалькі гадоў ДАЛ "Кактэбель" з'яўляецца базавым для праходжання студэнтамі БДУ педагагічнай практыкі.



На адкрыцці канферэнцыі выступіў дырэктар лагера А.М. Арлоў, які расказаў гісторыю яго стварэння і развіцця. Ён выказаў падзяку студэнтам БДУ, што працавалі ў якасці арганізатараў дзіцячага адпачынку, а таксама ўсяму педагагічнаму калектыву, які займаецца падрыхтоўкай студэнтаў. Асобна ён адзначыў напрацаваную сумесна метадычную базу, створаныя традыцыі.

Старшыня аргкамітэта канферэнцыі, прарэктар БДУ па вучэбна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях У.Б. Аджаеў уручыў лагеру віншавальны адрас і каштоўны падарунак ад імя рэктарата Белдзяржуніверсітэта. У сваім дакладзе ён звярнуў асаблівую ўвагу на педагагічную практыку студэнтаў як кампанент выхаваўчага працэсу ВНУ. Гэтая тэма знайшла шырокі розгалас сярод удзельнікаў канферэнцыі. Так, сацыяльны педагог БДУ, адказны за выкананне дагаворных абавязкаў паміж лагерам і Белдзяржуніверсітэтам, П.М. Бычкоўскі выступіў з дакладам аб практычных метадах падрыхтоўкі студэнтаў да праходжання педагагічнай практыкі. Прадстаўніца Варонежскага дзяржаўнага універсітэта І.Ф. Беражная расказала аб праблемах, з якімі сутыкаюцца студэнты падчас практыкі, і шляхах іх вырашэння.

На канферэнцыі быў зроблены шэраг дакладаў па праблемах практычнай педагогікі, псіхалогіі, прававых асноў, адміністрацыйнага кіравання. Асаблівая ўвага надавалася патрыятычнаму, экалагічнаму выхаванню дзяцей, прымяненню тэхнічных сродкаў выхавання і адукацыі, бяспецы дзяцінства і правам дзіцяці, удасканаленню формаў працы са студэнтамі, якія праходзяць педагагічную практыку. Была арганізавана выстава метадычных дапаможнікаў, новых формаў і метадаў педагагічнай і псіхолага-педагагічнай дзейнасці, дэманстраваліся метадычныя відэафільмы.

*Р.П. ПАПОК, псіхолаг студгарадка БДУ,*
*П.М. БЫЧКОЎСКІ, сацыяльны педагог БДУ*

# ПРАФЕСІЯНАЛЫ З ВАЕННАЙ КАФЕДРЫ

*Ваенная кафедра БДУ лічыцца адной з самых лепшых сярод іншых ваенных кафедраў ВНУ краіны. Больш за 70 гадоў яна рыхтуе афіцэраў запасу. Якім чынам удаецца падтрымліваць такі высокі ўзровень сёння? На гэтае пытанне адказаў начальнік ваеннай кафедры палкоўнік **Вячаслаў Сяргеевіч Трафімычаў:***

— Перш за ўсё гэта гісторыя і баявыя традыцыі, ля вытокаў якіх знаходзіўся маршал Г.К. Жукаў. Існуе адладжаная сістэма ваеннай адукацыі. Склаўся працаздольны творчы і дружны калектыў, які пастаянна шукае шляхі аптымізацыі навучальнага працэсу. На кафедры не любяць спыняцца на дасягнутых выніках. Навучальныя цыклы ўзначальваюць дасведчаныя кіраўнікі — палкоўнікі Сяргей Фядоткаў, Мікалай Лазараў, Віктар Таляронак, Аляксандр Лашук. І, вядома, мае намеснікі Андрэй Шкураў, Аляксандр Міронаў.

**— За 33 гады службы вы вывучылі войска знутры. Якім, на вашу думку, павінен быць афіцэр запасу ў наш час?**

— Прафесіяналам. Альтэрнатывы няма. Да нас трапляюць лепшыя з лепшых, студэнты, якія ўжо два гады навучаліся ў ВНУ. Наша задача — за два гады навучання на кафедры належным чынам навучыць іх вайсковай справе.

**— А ці маглі б выхаванцы ваеннай кафедры скласці канкурэнцыю курсантам Ваеннай акадэміі?**

— Студэнты цыкла баявога ўжывання артылерыі на баявых стрэльбах падчас ваенных збораў паказалі вынікі значна лепшыя, чым іх калегі з акадэміі. 98 працэнтаў студэнтаў, якія праходзілі стажыроўку на першасных афіцэрскіх пасадах, зарэкамендавалі сябе, па водгуках камандзіраў часцей і злучэнняў, як спецыялісты. І ні ў чым не саступалі выпускнікам акадэміі.

**— Якім чынам праходзіць адбор студэнтаў на ваенную кафедру?**

— Кожнага кандытата мы ацэньваем па наступных пазіцыях: сярэдні бал паспяховасці, маральна-дзелавыя якасці, стан здароўя, фізічная падрыхтоўка. А спецыялісты-псіхолагі вывучаюць індывідуальна-псіхалагічныя якасці. Штогод планка патрабаванняў да кандыдатаў уздымаецца — гэта павеў часу.

**— І як ішлі справы ў гэтым навучальным годзе?**

— Навучацца вайсковай справе вырашылі 503 студэнты з 14 факультэтаў. 104 з іх праходзяць падрыхтоўку па спецыяльнасці артылерыста, 78 — афіцэраў войскаў ППА, 20 — хімічных войскаў, 201 — мотастралковых войскаў. Яшчэ 80 студэнтаў атрымаюць у будучыні спецыяльнасць афіцэраў-псіхолагаў і афіцэраў-выхавальнікаў, 20 — афіцэраў-юрыстаў.

Паводле рашэння Міністэрства абароны, навучацца на ваеннай кафедры цяпер дазволена і дзяўчатам. Ад пачатку гэтага навучальнага года ў нас навучаецца 7 дзяўчат.

**— Некаторыя юнакі выкарыстоўваюць ваенную кафедру як "страху" ад службы ў войску. Як вы да гэтага ставіцеся?**

— Выявіць гэтую катэгорыю людзей на стадыі адбору вельмі складана. Нават калі б мы валодалі адмысловым псіхадыягнастычным прыборам, як "мудрамер". Але мы дакладна ведаем адно: ваенная кафедра не "страха" для ўхілістаў.

**— Пэўны час у СМІ паведамлялася, што мяркуецца масавы прызыў афіцэраў запасу ва Узброеныя Сілы. Наколькі гэта адпавядае сапраўднасці?**

— Прызыў — гэта не прэрагатыва начальніка ваеннай кафедры. Але мы не сумняемся, што нашыя выпускнікі, калі гэтага запатрабуюць абставіны, паспяхова справяцца з вучэбна-баявымі задачамі.

**— І на заканчэнне размовы хачу спытацца, якой вам бачыцца сістэма ваеннай адукацыі ў будучыні?**

— Тое, што мы закладваем сёння ў арганізацыю і змест навучання студэнтаў, будзе запатрабавана ў XXI стагоддзі. З чым сутыкнецца тады афіцэр? Якое ўзбраенне спатрэбіцца войску? Якімі будуць ваенная стратэгія і тактыка? Усё гэта мы павінны спрагназаваць. І ў навучальных праграмах улічваць новыя погляды, карэкціраваць сістэму падрыхтоўкі. Мы шчыльна супрацоўнічаем з Мінабароны, ваеннымі кафедрамі ВНУ, Ваеннай акадэміяй. Вядзем уласныя навукова-даследчыя распрацоўкі. З боку рэктарата БДУ ў гэтых складаных эканамічных умовах робіцца ўсё для таго, каб захаваць і ўмацаваць баявы патэнцыял кафедры. Сучасная навучальна-матэрыяльная база дазваляе рыхтаваць спецыялістаў экстракласа. Таму, калі ласка, запрашаем да нас!

*Вёў размову Анатоль КОНАНАЎ, член Беларускага саюза журналістаў, палкоўнік запасу*



*На здымку: палкоўнік В.С. Трафімычаў і афіцэры кафедры абмяркоўваюць праблемы рэфармавання навучальнага працэсу*

МІЖНАРОДНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

# НАВУКОВЫЯ ДЫЯЛОГІ

Прыемна, што ва універсітэце пашыраецца работа па ўзнаўленні былых навуковых сувязей з Йенскім універсітэтам. У мінулым навучальным годзе адбылася сустрэча студэнтаў 4-га курса гісторыка-архіўнага аддзялення гістарычнага факультэта БДУ з доктарам філасофіі кафедры ўсходне-еўрапейскай гісторыі Йенскага універсітэта Томасам Бонам. З улікам таго, што нямецкім даследчыкам вывучаецца праблема пасляваеннага аднаўлення Мінска (пераважна на падставе архіўных крыніц Беларусі), было вырашана засяродзіць увагу на пытаннях сацыяльна-эканамічных перамен у Беларусі, у тым ліку ўплыву савецкіх і партыйных органаў на метады і формы горадабудаўнічых работ.

Студэнтам было цікава пачуць аўтарскае разуменне цяжкіх абставін пасляваеннага становішча ў рэспубліцы, якая найбольш пацярпела ад дзейнасці германскага вермахта ў выніку палітыкі генацыду, разбурэння гаспадаркі, калі большасць людзей жыла ў земляных пабудовах.

У ходзе размовы быў ахарактарызаваны стан гарадской забудовы, яе формы і сацыяльная значнасць. Адценні новых падыходаў у аднаўленых населеных пунктах служылі такія паняцці, як "сацыялістычны", затым "камуністычны" горад.

Томас Бон параўнаў Мінск з гарадамі Еўропы, якія захавалі сваё сярэдневечнае аблічча. Ён звярнуў увагу на тое, што немалую частку аднаўленага горада да 1950 года зрабілі ваеннапалонныя германскага войска. Дарэчы, забудовы праспекта Скарыны і двух-трохпавярховыя будынкі ў раёне трактарнага завода існуюць і да гэтага часу.

Для працягу навуковага супрацоўніцтва нямецкаму вучонаму было прапанавана падрыхтаваць і прачытаць для студэнтаў невялікі курс лекцый, якія ён чытае ў Йенскім універсітэце, — "Маскоўская і нямецкая гістарычныя школы ў XIX — пачатку XX стагоддзя. Спроба кампаратыўнага аналізу". Такія лекцыі жадаючыя праслухалі ў верасні, а таксама прынялі ўдзел у працы круглага стала, дзе абмяркоўваліся пытанні стану і перспектываў гістарычнай навукі ў Беларусі.

*К.І. КАЗАК, дацэнт кафедры крыніцазнаўства і музеязнаўства гістарычнага факультэта БДУ*

КАНФЕРЭНЦЫІ

# БІБЛІЯТЭКА Ў ПЕРАМЕНЛІВЫМ СВЕЦЕ

Мінулым летам у горадзе Судак, што знаходзіцца ў Аўтаномнай Рэспубліцы Крым, праходзіла VI Міжнародная канферэнцыя "Бібліятэкі і асацыяцыі ў пераменлівым свеце: новыя тэхналогіі і новыя формы супрацоўніцтва". Крымская канферэнцыя ўжо стала штогадовым мерапрыемствам, якое праводзіцца ў рамках IFLA (Міжнароднай федэрацыі бібліятэчных асацыяцый).

У канферэнцыі прынялі ўдзел больш за 800 чалавек з 30 краін. Універсітэцкія бібліятэкі былі прадстаўлены 102 бібліятэкамі з 63 універсітэтаў 14 краін, у тым ліку: ЗША (Мемфіс, Аклахома), Германія (Гановер), Кітай (Рэньмінь), Нідэрланды (Амстэрдам), ПАР (Прэторыя), Турцыя (Стамбул).

Сярод удзельнікаў канферэнцыі можна было сустрэць дырэктараў, кіраўнікоў аддзелаў, галоўных спецыялістаў бібліятэк, рэктараў і выкладчыкаў ВНУ, прэзідэнтаў і дырэктараў фірмаў, прадстаўнікоў службаў інфармацыі, каардынатараў і экспертаў бібліятэчных праектаў, навуковых супрацоўнікаў, аспірантаў, студэнтаў, інжынераў-праграмістаў. Упершыню на гэтай канферэнцыі былі супрацоўнікі фундаментальнай бібліятэкі БДУ.

Усіх удзельнікаў аб'ядноўвала велізарнае жаданне падзяліцца досведам і дасягнутымі поспехамі ва ўдасканаленні бібліятэчных тэхналогій. Абменьваючыся думкамі з калегамі з іншых краін, супрацоўнікі фундаментальнай бібліятэкі нашага універсітэта змаглі знайсці рашэнні некаторых складаных задач, якія стаяць перад бібліятэкай, наладзіць дзелавыя кантакты са многімі бібліятэкамі, выдавецкімі і кнігагандлёвымі фірмамі.

Бібліятэка БДУ атрымала інфармацыйныя матэрыялы, кампакт-дыскі "Поўны збор твораў А.С. Пушкіна" і "Information USA". Была дасягнута папярэдняя дамоўленасць з супрацоўнікам аддзела інфармацыі і камунікацый факультэта гуманітарных і сацыяльных навук Манчэстэрскага універсітэта Марыяй Бурк аб правядзенні ў БДУ практычнага семінару па інфармацыйных тэхналогіях у бібліятэках.

Хацелася б выказаць велізарную ўдзячнасць рэктару БДУ А.У. Казуліну і начальніку ўпраўлення бухгалтарскага ўліку і фінансаў В.П. Саладусе, дзякуючы якім гэтая камандзіроўка змагла адбыцца. Спадзяюся, што наша бібліятэка і надалей будзе прымаць удзел у Крымскіх канферэнцыях, таму што гэта спрые развіццю бібліятэкі. Такія бібліятэкі апераджаюць іншых не толькі ў справе аўтаматызацыі, але і ва ўменні наладжваць грамадскія сувязі, прыцягваць дадатковыя сродкі. Адсюль высноваа: трэба ездзіць. Каб працаваць і навучацца.

*А.В. БУЦІНА,*
*загадчык аддзела камплектавання і каталагізацыі фондаў Фундаментальнай бібліятэкі БДУ*

ПАДРЫХТОЎЧЫ ФАКУЛЬТЭТ

# ПРЭСТЫЖ УНІВЕРСІТЭТА

У Беларускім дзяржаўным універсітэце існуе падрыхтоўчы факультэт для замежных грамадзян. На сёння ў ім навучаецца 142 чалавекі, аднак 99% складаюць студэнты з Кітая. Таксама ёсць студэнты з Калумбіі, Польшчы, Лівана. Студэнты навучаюцца 1 год, каб ім было далей лягчэй слухаць лекцыі, яны вывучаюць рускую мову. Рыхтуюцца яны 10 месяцаў і далей ідуць вучыцца ў вышэйшыя ўстановы. Каштуе гэта 1000 долараў ЗША ў год плюс 150 долараў за агульнае памяшканне. Кошт за падрыхтоўчае навучэнне вышэй, чым у іншых ВНУ РБ, аднак падрыхтоўка лепшая, а таксама ўплывае яшчэ і прэстыж БДУ.

Па словах дэкана падрыхтоўчага факультэта А.В. Паўлава, у гэтым годзе вельмі здзівілі студэнты з Кітая. Яны прыехалі ўсе разам і адразу пачалі вучыцца. Раней яны прыязджалі па паўгода, і былі цяжкасці з навучальнай праграмай. Таксама ў папярэднія гады яны больш ішлі вучыцца на гуманітарныя навукі, а ў гэтым годзе многія ідуць у прыродазнаўчыя навукі. Наша адукацыя вельмі добрая і каштуе танней, чым за мяжой. Пасля заканчэння адукацыі многія замежныя студэнты застаюцца працаваць у нас, іншыя едуць дадому кваліфікаванымі спецыялістамі.

Сёння многія пытаюць: "Навошта БДУ патрэбен падрыхтоўчы факультэт для замежных грамадзян?" Але ў гэтым і ёсць прэстыж БДУ. Гэта вельмі важна для ўстанаўлення міжнародных сувязяў у будучым і станаўлення БДУ ў міжнароднай сістэме адукацыі.

*Ксенія МАСАЛЁВА*

ДЛЯ ЦЯБЕ

# МАДЭЛІ З БДУ

*Сёння амаль кожная дзяўчынка марыць аб прафесіі мадэлі. Гэта зразумела, бо паўсюль мы бачым здымкі прыгажунь у модных часопісах ці на тэлебачанні вядучых з абаяльнай усмешкай. Як тут не жадаць быць самай прыгожай, але для гэтага трэба шмат рабіць і многа працаваць. І дапамагаюць дзяўчатам у гэтай нялёгкай справе мадэльныя агенцтвы, з якіх вылучаюцца сапраўдныя зоркі. У Мінску існуе некалькі вядомых агенцтваў: "Тамара", "Elite Stars", "Студыя моды Сяргея Нагорнага" і агенцтва мадэляў Сашы Варламава.*

*А каб больш падрабязна даведацца пра патрабаванні для будучых мадэляў, мы спыталі дырэктара студыі моды — **Сяргея Нагорнага.***

**— Якія ў вас патрабаванні да мадэляў?**

— Мы прымаем дзяўчат з 14 гадоў (рост ад 170 см), хлопцаў з 16 гадоў (рост ад 180 см), а таксама дзяцей з 10 гадоў.

**— А якія дысцыпліны вывучаюць у студыі моды?**

— Наталля Макей, мадэль агенцтва "Тамара", займаецца з дзяўчатамі дэфіле. Дзіна Георгіеўна Тыцюк, прафесар Інстытута сучасных ведаў, настаўнік універсітэта культуры, чытае такія дысцыпліны, як майстэрства акцёра і этыкет. Правядзенню заняткаў па макіяжы і модзе прычоскі садзейнічае салон прыгажосці "Першая лэдзі і лепшы мужчына". А фітнес-пластыку ў нас выкладаюць трэнеры, якія ездзяць на стажыроўкі ў Чэхію і Штаты. З іх дапамогай дзяўчаты выпраўляюць свае фігуры.



**— Якім крытэрыем вы карыстаецеся пры выбары будучых мадэляў?**

— У мяне крытэрыю няма. Мне падабаюцца ўсе, таму што ў кожнага чалавека ёсць індывідуальныя, непаўторныя рысы. Але я набіраю 2 дарослыя групы па 15 чалавек і дзіцячую групу з 12 чалавек. І з кожнай групы ў мяне застаюцца па 5 чалавек. Застаюцца дзяўчаты не менш 175 см. Мы глядзім на знешні выгляд, а таксама на вынікі іх навучання ў школе.

**— А якія ў вас планы на будучае?**

— Я жадаю быць больш зносін з Масквой і з Захадам, а таксама з мужчынскім маскоўскім агенцтвам "Мартын-М". А зараз адна з нашых дзяўчынак паехала ў Францыю.

**— Ці ёсць у вас сувязі з агенцтвамі іншых краін?**

— "Студыя моды Сяргея Нагорнага" мае свой адрас у сусветнай камп'ютэрнай сетцы Інтэрнэт. Гэта дае магчымасць букерам мадэльных і рэкламных агенцтваў усяго свету знаёміцца з нашымі мадэлямі. Так, нашых мадэляў запрашалі ў маскоўскія, французскія і нямецкія агенцтвы.

**— А якая атмасфера ў вашым агенцтве?**

На гэта пытанне мне адказаў Вадзім Гадун, які працуе мадэллю ў агенцтве:

— Атмасфера вельмі цудоўная, мы ўсе сябруем і сустракаемся не толькі ў час працы. І гэта ўсё з-за нашага дырэктара Сяргея Нагорнага, які аб'ядноўвае нас усіх.

**— Дзякую вам за вашы адказы!**

Наступны набор у "Студыю моды Сяргея Нагорнага" будзе праводзіцца ў лістападзе па адрасе: пр. Машэрава, 17. Аднак пры БДУ арганізаваў таксама курсы для будучых мадэляў і Саша Варламаў. Туды прымаюцца толькі студэнты БДУ. 16 верасня адбыўся першы набор на бясплатнае навучанне ў гэтым годзе. Было многа хлопцаў і дзяўчат, таму было вельмі цяжка выбраць лепшых.

А мы жадаем поспеху ўсім пачынаючым у мадэльным бізнесе.

*Ксенія МАСАЛЁВА*

# СТРЭС... ШТО ГЭТА ТАКОЕ?

Здаецца, кожны чалавек адразу гатовы адказаць на гэта пытанне, бо аб праблеме стрэсу сказана і напісана вельмі шмат. Аднак ахарактарызаваць дакладнымі словамі гэтую хваробу сучаснага грамадства аказваецца не па сілах не толькі простаму чалавеку, але і спецыялісту. У меркаванні, што сабой уяўляе стрэс, прысутнічае вялікая колькасць рознагалоссяў, нягледзячы на вялікія пошукі па гэтай тэме ў псіхалагічнай літаратуры.

А яна, у сваю чаргу, спасылаецца на вялікую колькасць розных версій. Аднак асобныя падыходы ў даследаванні стрэсаў можна аб'яднаць у дзве вялікія групы. Першая група спецыялістаў грунтуецца на клінічным вопыце, вызначаючы стрэс як унутраны стан арганізму. У другую групу ўваходзяць спецыялісты, якія разумеюць стрэс з пункту гледжання абставін, г.зн. як з'яву творчай дзейнасці.

Нягледзячы на тое, што тэорыі стрэсу і яго асобным формам прысвечаны шматлікія навуковыя працы, аднак у цэлым, на жаль, няма адзінай, поўнай і правільнай канцэпцыі стрэсу.

Усім вядомы рад фактараў, якія выклікаюць стрэсавыя рэакцыі: забруджванне навакolля, нестабільнасць і нявызначанасць сацыяльна-эканамічных працэсаў, беспрацоўе, якое беспарапынна расце, крымінальная экспансія, неадэкватнае харчаванне і г.д.

На жаль, у Беларусі і іншых краінах СНД назіраюцца ўсе вышэйзгаданыя фактары, што робіць праблему стрэсу для нашых суайчыннікаў асабліва вострай.

Цікавымі здаюцца вынікі даследаванняў, праведзеных вядомымі амерыканскімі псіхолагамі Фолкманам і Лазарусам падчас праверкі розных аспектаў рэакцыі на стрэс пры вывучэнні студэнтаў. Стрэсарам (прычынай гэтай "хваробы") у дадзеным выпадку з'яўлялася правядзенне экзаменаў. Не сакрэт, што ў многіх маладых людзей у абставінах навучання часам узнікаюць даволі цяжкія псіхалагічныя праблемы, якія могуць прывесці да сур'ёзных фізічных ці разумовых змен. Што можа з'явіцца прычынай падобных праблем? Гэта, магчыма, і пачуццё неадпаведнасці патрабаванням, і націск з боку равеснікаў і г.д. А ў паводзінах усё гэта праяўляецца як няпамятлівасць, неарганізаванасць, губляецца інтарэс да вучобы, і, што самае горшае, вынікам могуць стаць псіхічныя захворванні. Вось тут і хаваецца галоўная небяспека — перарастанне стрэсавага стану ў дыстрэс, што, безумоўна, нічога станоўчага для псіхікі студэнта не нясе. Такім чынам, спадары настаўнікі, улічвайце той факт, што сесія — гэта цяжкое псіхалагічнае выпрабаванне не толькі для вас, але яшчэ ў большай ступені для навучэнцаў.

У гэтым сэнсе здаецца карысным вопыт многіх школ і каледжаў на Захадзе, якія далучаюць навучэнцаў да пэўных кансультантаў. На думку спецыялістаў, больш асабістыя ўзаемаадносіны з кіраўніком прыводзяць да зніжэння стрэсу. Вядома таксама, што сям'я і блізкія для асобы людзі могуць дапамагчы зменшыць наступствы стрэсу. Таму бацькам і педагогам неабходна навучыць падлеткаў уважліва ставіцца адзін да аднаго. Важна расказаць маладым людзям аб магчымасці супрацоўніцтва ў спецыяльных сацыяльных праграмах. Гэта зробіць юнакоў не толькі больш чулымі, але і навучыць пазітыўна ўплываць на сітуацыю. А наогул, трэба адзначыць, што менавіта актыўная пазіцыя чалавека вызначае яго трываласць у негатыўных жыццёвых сітуацыях. Таму не дзіўна, што стрэс, які звязаны з творчай дзейнасцю, а не з цяжкімі псіхалагічнымі праблемамі, уплывае на арганізм толькі станоўча.

Так што ва ўсім можна знайсці добрыя бакі.

*Валерыя ЛУЦКОВА*



# КРЫМІНАЛЬНАЯ ХРОНІКА

***

У сваіх службовых паўнамоцтвах заблыталася ўрач сталічнага дыягнастычнага цэнтра Ш., якая мела намер вызваліць ад вайсковага абавязку прызыўніка В. Атрыманая 300-доларавая ўзнагарода за выдачу лжывага медыцынскага заключэння можа скончыцца для яе турэмным зняволеннем.

***

На працягу мінулага года не асабліва зважала на падатковае заканадаўства дырэктар агенцтва нерухомасці М. Скарыстоўваючы няўлічаныя дагаворы на аказанне інфармацыйна-даведачных паслуг, яна схавала ад падаткаабкладання даход прадпрыемства на суму звыш 600 мільёнаў рублёў. Хто ведае, які матэрыяльны ўрон дзяржаве нанесла б у будучыні грамадзянка М., калі б не спрацавалі зладжана супрацоўнікі аддзела эканамічных злачынстваў Маскоўскага раёна.

***

Грамадзянін М. знайшоў больш хуткі спосаб заробку: уладкаваўшыся вартаўніком на аўтастаянку, на другі дзень працы ён скраў грошы, заплочаныя кліентамі за ахову аўтатранспарту. Аднак у хуткім часе ён быў затрыманы супрацоўнікамі эканамічных злачынстваў Маскоўскага РУУС.

*Вікторыя МАЛЫШКА,*
*супрацоўнік Маскоўскага РУУС*



# *Новы позірк*



У Нацыянальным музеі Беларусі ладзілася выстава "Новы позірк. 1929. Фотаздымкі Ціны Мадоцці". Яна мела поспех як у прафесіяналаў, так і ў аматараў фотамастацтва. Да нас выстава прыехала з Масквы, дзе таксама зацікавіла вельмі многіх.

Ціна Мадоцці — жанчына незвычайная. Народжаная ў беднай італьянскай сям'і ў 1896 годзе, яна вырасла ў ЗША, куды сям'я пераехала на пачатку нашага стагоддзя. На пачатку 20-х гадоў Ціна пакінула кар'еру фотамадэлі і актрысы Галівуда, каб разам з сваім каханым Эдвардам Вестанам, славутым фотамайстрам, пераехаць у Мексіку, дзе адбылася рэвалюцыя.

Разам з Вестанам Ціна асвойвае "новую фатаграфію", даследуе магчымасці фотасправы — незвычайныя ракурсы, танальныя кантрасты і г.д. Але нават знаходзячыся ў плыні авангарднага фотамастацтва, Ціна Мадоцці захоўвала жаноцкасць, якая, аднак, не пераходзіла ў сентыментальнасць. Яе "Ружы" — не нацюрморт у звыклым сэнсе гэтага слова, а дзівосныя аб'екты, арганічная структура якіх праступае як вынік фармальнага эксперыменту.

Яе здымкі нацыянальнай архітэктуры — гэта спроба ўбачыць гісторыю новымі вачыма. Старажытныя пабудовы паўстаюць спалучэннем святла і цені — гэта новы арыгінальны прыём Мадоцці.

Мастакі і рэвалюцыянеры, жанчыны і дзеці вуліцы, знаёмыя і незнаёмыя людзі былі героямі фотаздымкаў Ціны. Яна сама стала часткай рэвалюцыі, актыўнай удзельніцай стварэння новай культуры Мексікі.

Аднак Мексіку яна вымушана была пакінуць. Апынуўшыся ў Маскве, Мадоцці стала агентам Камінтэрна і фатаграфіяй больш не займалася.



Італьянка па паходжанні і мексіканка па перакананнях, Ціна Мадоцці заняла годнае месца ў мастацтве Мексікі першай паловы XX стагоддзя. І сёння яе працы і яе асоба прывабліваюць да сябе ўвагу мастакоў, фатографаў, выдаўцоў.

*Ксенія МАСАЛЁВА,*
*студэнтка журфака*

# У ПОШУКАХ ВЫРАТАВАННЯ



*З кожным днём гэтых людзей становіцца ўсё больш і больш. Адны ўспрымаюць іх як злачынцаў, іншыя – як безнадзейна хворых. Яны наркаманы. Лічбы статыстыкі няўмольна растуць. Але рэальныя лічбы, калі верыць спецыялістам, у дваццаць разоў большыя. Мы жывем побач з імі, па-сапраўднаму іх лёс хвалюе толькі блізкіх і тых, на чыім сумленні ляжыць іхняе выратаванне, – дактароў-нарколагаў.*

*У дварах, сярод жылых дамоў, схаваўся невялікі шэры будынак з кратамі на вокнах. Гэта і ёсць гарадскі наркалагічны дыспансер, дзе мы сустрэліся з галоўным урачом-нарколагам* ***С.М. Малочкам.***

**— Скажыце, калі ласка, колькі наркаманаў знаходзіцца ў вас на ўліку і як яны да вас трапляюць?**

— На сённяшні дзень у Мінску 1192 хворых наркаманіяй. Сярод іх 159 жанчын і 164 падлеткі. Часцей за ўсё (70%) іх дастаўляе да нас альбо міліцыя, альбо бацькі — тут гаворка ідзе пра 16-18-гадовых юнакоў і дзяўчат, якія яшчэ ні маральна, ні фізічна не гатовыя змагацца з гэтай хваробай. Каля 25 працэнтаў звяртаецца па дапамогу самастойна. Астатнія 5 працэнтаў — пераважна выпадкова, праз якія-небудзь іншыя лячэбныя ўстановы.

**— Ці практыкуецца ў вас ананімнае лячэнне?**

— Практыкуецца, і дастаткова шырока. Усе тыя, хто знаходзіцца ў складаных адносінах з законам, жадаюць лячыцца ананімна.

**— Што вы маеце на ўвазе пад складанымі адносінамі?**

— Ёсць такі маленькі нюанс... У нас ёсць два артыкулы або два варыянты ўзаемаадносін наркамана з законам: ён можа быць спажыўцом, ён можа быць распаўсюджвальнікам. Спажыванне крымінальна не караецца і не праследуецца, распаўсюджванне наадварот крымінальна караецца, і дастаткова жорстка. Таму, калі ў чалавека знаходзяць наркотык, ён усяляк імкнецца даказаць, што ён наркаман (гэта значыць спажывец) і "добраахвотна" згаджаецца на лячэнне ў нашым стацыянары. Наколькі гэта добраахвотна — аднаму Богу вядома. Але практычна ўсе згодныя стаць спажыўцамі, каб не адказваць перад законам.

**— Сяргей Міхайлавіч, колькі чалавек сёння знаходзіцца ў вас у стацыянары?**

— Аддзяленне ў нас невялікае — усяго 20 пакояў. У мінулым годзе лячэнне прайші 256 чалавек за год, а ў гэтым годзе за паўгоддзе ўжо 300 чалавек.

**— А колькі прыблізна працэнтаў людзей больш не звяртаецца да вас пасля лячэння?**

— Працэнт цалкам вылечаных ад гераінавай залежнасці вельмі малы. Не толькі ў нас — ва ўсім свеце. Зараз, з распаўсюджваннем гераіну, у сувязі з тым, што ён стаў больш танным, сітуацыя стала ўскладняцца. Калі раней асноўнымі кліентамі былі аматары маку (для фізічнай залежнасці патрабуецца 20-30 ін'екцый на працягу месяца), то цяпер — практычна толькі гераінавыя наркаманы (тут дастаткова двухтрох уколаў — і ты ўжо раб). Па нашых назіраннях, існуе каля 20 працэнтаў рэмісіі, гэта значыць стану часовага паляпшэння. Аднак мы рабілі гэтыя даследаванні ўпершыню. Таму я не магу быць да канца ўпэўнены ў верагоднасці гэтай лічбы. Але гэта сапраўды нядрэнны паказчык.

**— Калі наркаман праходзіць лячэнне, з вас аўтаматычна здымаецца адказнасць за яго далейшае жыццё?**

— Безумоўна, не. Яны знаходзяцца ў нас на дыспансерным або прафілактычным уліку (у залежнасці ад абставін, пасля якіх яны трапілі ў поле зроку нашых дактароў).

З пачатку 90-х гадоў большасць еўрапейскіх краін практыкуе падтрымліваючае лекаванне такімі наркотыкамі, як метадон і полімідон. Гэта прэпараты, якія зніжаюць непажаданы эфект ад прыёму гераіну і не выклікаюць пры гэтым ніякіх іншых анамалій. У прынцыпе, гэта тая ж самая залежнасць, толькі гэта прэпарат не мяняе настрой і паводзіны чалавека, а толькі здымае адмоўныя наступствы.

**— Як вы асабіста ставіцеся да падобных замяняльнікаў?**

— Адзін з нашых калег вельмі ясна сказаў, што ніводная замена не вырашае ўсіх праблем, як няма ніводнага прэпарата, які б лячыў гіпертанію, язвавую хваробу і г.д. Але як неабходны набор, як аксесуар, ён павінен прысутнічаць. Усё лячэнне павінна адбывацца на ўзор шведскага стала: пацыент сам адчувае, што яму неабходна. Сапраўды, хворыя абы што прымаць не будуць, і ў сваіх пытаннях яны такія спецыялісты, што кожнаму медыцынскаму работніку могуць даць фору. Сакрата яны вывучылі добра і ведаюць сябе выключна: ведаюць, які прэпарат ім падыдзе, які — не. Таму спярша пацыенту неабходна паведаміць свае высновы ці выбар, а ўжо прыняць гэта ці не — яго выбар. Ва ўсёй Еўропе гэта атрымала шырокае распаўсюджанне: немцы, напрыклад, даюць 30 працэнтаў рэмісіі і звязваюць гэта менавіта з метадонам і полімідонам. Але ў нас усё ж свой менталітэт...

**— А ў чым канкрэтна заключаецца курс лячэння на стацыянары?**

— Курс лячэння заключаецца ў купіраванні ломкі. Ломка — гэта сіндром адмены: калі хворы на нейкі час перастае прымаць наркотыкі, то ў яго надыходзіць вельмі цяжкі стан, які характарызуецца зменай псіхікі, слязамі, сустаўнымі болямі і болямі цела і г.д. Пры дапамозе розных медыкаментаў, якія ёсць у нашым арсенале, гэты стан купіруецца. Лячэнне займае каля 10 дзён, а далей ва ўсіх цывілізаваных краінах пачынаецца так званы рэабілітацыйны этап. Рэабілітацыйны этап — гэта рэабілітацыйныя цэнтры або спецыялізаваныя аддзяленні, у якіх гэтыя пацыенты павінны знаходзіцца некалькі месяцаў (сярэдні тэрмін лячэння — паўгода). У нас у ліпені ішлі пошукі месца для арганізацыі Рэспубліканскага цэнтра рэабілітацыі наркаманаў. Але адна справа шукаць, а другая — знайсці. Так што пакуль усё віламі па вадзе пісана... Увогуле, у Расіі такіх аддзяленняў практычна няма, ва Украіне — таксама, хаця наркаманаў там у 20 разоў болей, чым у нас. Толькі адно такое аддзяленне ёсць у Вільнюсе... А будучыня ж менавіта за такімі рэабілітацыйнымі аддзяленнямі, як у немцаў ці яшчэ ў каго-небудзь. У такіх аддзяленнях псіхатэрапеўты і псіхолагі займаюцца з пацыентамі ад 8 да 12 гадзін у суткі. Натуральна, таму чатыры паказчыкі ў іх перавышаюць нашыя.

**— Крыху раней мы казалі пра колькасць хворых, якія знаходзяцца ў вас на стацыянары. А колькі ж усяго наркаманаў у Беларусі?**

— Каб атрымаць больш ці менш рэальную лічбу, трэба гэта памножыць на 10 (зыходзячы з сусветнай статыстыкі). Можа, у нашай не зусім цывілізаванай дзяржаве можна ўжо памножыць і на 20. На самой справе, пра рэальную лічбу меркаваць цяжка і страшна. Паводле прагнозаў, у краіне на 2000 год будзе 50 тысяч наркаманаў, а гэта — велізарная лічба, улічваючы насельніцтва Беларусі.

**— Значыць, становішча штогод пагаршаецца?**

— Мяркуйце самі: сёлета колькасць тых, хто стаіць на ўліку, у нас павялічылася на 40 працэнтаў у параўнанні з 97-м годам. Таму пакуль наркотыкаў будзе шмат, шмат будзе і спажыўцоў.

**— Ці праўда, што наркаманы жывуць нядоўга — 5-10 гадоў?..**

— На жаль, так. Часцей за ўсё яны паміраюць ад передазіроўкі. За гэта паўгоддзе памерлі два чалавекі, прычым у другім выпадку прычына да канца не высветлена. Да гэтага такіх выпадкаў у медыцынскіх інстанцыях зарэгістравана не было.

**— Перадазіроўка — гэта з'ява, часцей за ўсё ўласцівая "навічкам"?**

— Сама залежнасць характарызуецца зменай рэактыўнасці, г.зн. для таго, каб атрымаць адчуванне таго ж маштабу, як і на-

БЕЗ НАРКОТЫКАЎ

пярэдадні, давядзецца павялічваць і павялічваць дозу. Не ўсе могуць кантраляваць сябе ўвогуле... Хаця, у цэлым, гэтая доза індывідуальная. У нас ёсць пацыент, які коле па два грамы какаіну ў суткі, а ёсць такія, каму хапае 0,5 грама.

**— Ад чаго гэта залежыць?**

— Гэта залежыць і ад абмену рэчываў, і ад камплекцыі, ад фізічнага стану, і ад таго, ці ёсць у яго ўвогуле якія-небудзь спосабы атрымання задавальнення. Ёсць людзі, якія дастаткова сур'ёзна сядзяць на наркотыках, але адначасна займаюцца бізнесам і дастаткова сур'ёзнымі справамі. Такі чалавек цудоўна разумее, што калі ён страціць справу, то згубіць і наркотыкі — іначай кажучы, страціць усё. Таму ў гэтых людзей адчуванне кантролю наладжана больш моцна.

**— Скажыце, калі ласка, калі дыягназ паставілі, г.зн. вынеслі прысуд, якое пачуццё вы перажываеце ў дачыненні да свайго пацыента?**

— Да кожнага пацыента я стаўлюся як да хворага чалавека. Іншая рэч, калі прыводзяць да цябе 15-16-гадовае дзіця... Асуджай яго, не асуджай — у яго ж яшчэ псіхіка няцвёрдая. Падсунулі, падставілі, а то і пасадзілі на іголку... Ну як да яго ставіцца? У чым ён вінаваты? Такіх мы ўсяляк спрабуем падтрымаць у гэтым жыцці. Почасту ім ставіцца дыягназ "эпізадычнае спажыванне наркатычных сродкаў", хаця доктар бачыць, што там "ужо падае лісце"...

**— Дзе ж шукаць выйсце?**

— Патрэбна іншая дзяржаўная палітыка, каб наркаман не баяўся ісці да доктара. Яму трэба даць альтэрнатыву, бо "з іголкі" цяжка "здымацца" самому. Па-першае, не павінна быць такой рэпрэсіўнай сістэмы ў дачыненні да гэтых людзей. Па-другое, неабходна ўсё ж такі падтрымліваючае лячэнне — пераход на больш лёгкі наркотык. Дактары на тое ж і існуюць, каб дапамагаць. Але дапамагчы можна толькі таму, хто сам гэтага хоча.

Для іх паведамляю, што гарадскі наркалагічны дыспансер знаходзіцца па адрасе: вул. Гастэлы, 16, тэл. 223-58-21.

А яшчэ мне хочацца нагадаць, што мы ўсё ж такі — нацыя, а не зборышча людзей, якія не любяць і не паважаюць адзін аднаго. Таму менавіта нам неабходна клапаціцца пра здароўе нашай нацыі.

*Валерыя ЛУЦКОВА*

# САМ-НАСАМ З ХВАРОБАЙ

*Прага да наркотыкаў паглынае ўсе думкі чалавека. Адбываюцца змены ў асобе, паводзінах, маральная дэградацыя, якая суправаджаецца асацыяльнымі дзеяннямі – крадзяжом, рабункам, бадзяжніцтвам, прастытуцыяй.*

*Падобнае здарылася і з нашым героем. Але ён знаходзіць у сабе сілы супрацьстаяць гэтай страшнай хваробе. Ён працаваў дыск-джакеем на мінскіх дыскатэках. Да наркотыкаў ставіўся адмоўна, але яго асяроддзе прытрымлівалася іншай думкі.*

**— Якім чынам вы ўпершыню паспрабавалі наркотыкі?**

— Як і ў многіх, гэта адбылося на дыскатэцы — пачаставалі сябры. Упершыню я пакаштаваў какаін. Мне стала добра: ад какаіну вельмі хочацца рухацца, танчыць, размаўляць.

**— А потым вы працягнулі ўжыванне наркотыкаў?**

— Так, я перайшоў на "траву". Курыў тры месяцы. Потым пакаштаваў экстазі, які мне вельмі спадабаўся. Ад яго мазгі пачынаюць працаваць у пяць разоў лепей. З'яўляецца шмат энергіі, хочацца рабіць дабро людзям. Ты не можаш спыніцца, няма стомленасці. Спярша я еў па палове таблеткі, а потым з'ядаў па пяць таблетак за дыскатэку. Часам зранку, калі трэба было ісці ў інстытут, еў яшчэ таблетку. Усе навокал, канешне, разумелі, у якім я стане, бо казаў неверагодныя рэчы.

Пасля гэтага пакаштаваў ЛСД, але экстазі спадабалася болей. Аднойчы, на "выхадзе", пасля экстазі пакаштаваў гераін. Тлумачу, "выхад" — гэта дэпрэсія, табе кепска. І калі зусім цяжка "выходзіць", мне параілі нюхаць гераін.

**— А ломкі ў вас былі?**

— Так, вядома. Ад наркотыкаў бываюць дзве залежнасці: псіхалагічная і фізічная. Фізічная — гэта і ёсць ломка, калі ўначы не можаш спаць, не можаш знайсці сабе месца. У цябе адчуванне, нібы мяса адзяляецца ад костак і пазваночнік праварочваецца вакол сваёй восі.

**— А дзе вы бралі грошы на наркотыкі?**

— На наркотыкі сыходзіць шмат грошай. Па маіх падліках, я выдаткаваў каля 15 тысяч долараў. Грошы я зарабляў, працуючы ды-джэем. Плюс — працаваў у брыгадзе. Было шмат грошай, зробленых несумленным шляхам. Пасля таго, як кінуў ужываць наркотыкі, я поўнасцю змяніў свае погляды. Несумленныя грошы — гэта не для мяне.

**— Чаму вы перасталі ўжываць наркотыкі?**

— Па-першае, мяне выгналі з інстытута, і я зрабіў усё, каб мяне аднавілі. Я здаў усе экзамены на "выдатна" і зараз збіраюся паступаць у аспірантуру. Па-другое, мне дапамог Бог. Я заўжды верыў у Бога, і кожны прыход у царкву мне дапамагаў. Па-трэцяе, у мяне рэзка сапсаваліся адносіны з сябрамі. Мяне пакідалі блізкія мне людзі. І я зразумеў: чым болей я зарабляў, тым болей губляў. Такое больш працягвацца не магло. Зараз я цалкам змяніў свой светапогляд і вельмі стараюся не трапіць у гэтае асяроддзе зноў.

**— Дзякуй вам за адказы. Жадаю ўсяго найлепшага ў будучыні!**

*Ксенія МАСАЛЁВА*

ШКОЛА ПЕРШАКУРСНІКА

# ВАМ ДАПАМОЖА ПСІХОЛАГ

У студэнцкія гады маладыя людзі асабліва востра адчуваюць патрэбу ў прафесійнай псіхалагічнай дапамозе. У першую чаргу гэта тычыцца студэнтаў, якія жывуць у інтэрнаце, бо яны адарваныя ад дома, пазбаўленыя бацькоўскага клопату і падтрымкі. Дапамагчы ў вырашэнні псіхалагічных праблем студэнтам можа сацыяльна-псіхалагічны даследчы цэнтр (СПДЦ) студэнцкага гарадка БДУ.

Сацыяльна-псіхалагічны цэнтр працуе ўжо другі год. За гэты час псіхолагі цэнтра распрацавалі некалькі асноўных накірункаў сваёй дзейнасці: кансультаванне, дыягностыка, асветніцкая праца і развіваючая дзейнасць.

Кансультатыўная дзейнасць прадугледжвае аказанне псіхалагічнай дапамогі студэнтам у форме адказаў на складаныя пытанні, вырашэння канфліктных сітуацый, дыягнастычнай ацэнкі розных бакоў псіхікі. Практыка паказала, што студэнты часта звяртаюцца да псіхолага па кансультацыю, асабліва тыя, хто мае складанасці ў сферы міжасабовых зносін, цяжкасці ў наладжванні кантактаў.

Дыягнастычная работа ўяўляе сабой псіхолага-педагагічнае даследаванне, выяўленне індывідуальных асаблівасцей псіхікі. Псіхолагі цэнтра распрацавалі праграму "Псіхалагічны партрэт асобы", якая ўключае блокі методык па розных асабовых характарыстыках.

Асветніцкая работа з'яўляецца важнай састаўной часткай дзейнасці СПДЦ. Яна праводзіцца як са студэнтамі, так і з педагогамі студэнцкага гарадка і ўключае ў сябе метадычныя заняткі па актуальных праблемах, лекцыйныя і семінарскія заняткі школы актыву, падрыхтоўку метадычных матэрыялаў і інфармацыйных стэндаў, падрыхтоўку матэрыялаў у газету "Беларускі універсітэт".

У рамках развіваючай дзейнасці праводзяцца трэнінгавыя заняткі, праблемныя семінары, дыспуты.

Цэнтр вялікую ўвагу надае пытанням прафесійнай самарэалізацыі. Прафарыентацыйная праграма ўключае методыкі па дыягностыцы па прафпрыдатнасці, дыягностыцы кіраўнічых якасцей, ацэнцы сацыльнага патэнцыялу.

На падставе аналізу дадзеных сацыялагічных апытанняў і псіхалагічнага кансультавання спецыялісты цэнтра плануюць стварэнне базы дадзеных псіхолага-педагагічных характарыстык. Такая база дапаможа сацыяльным педагогам і педагогам-арганізатарам у працы, дазволіць карэкціраваць выхаваўчы працэс, вызначаць накірункі індывідуальнай работы.

У заключэнне хочацца адзначыць, што не толькі эфектыўнасць выхаваўчага ўздзеяння, але і паспяховасць студэнтаў у многім залежыць ад таго, ці дапаможа ім псіхалагічная служба належным чынам адаптавацца ў новым асяродку, бесканфліктна наладжваць міжасабовыя зносіны, рэалізаваць сябе як асобу.

Сацыяльна-псіхалагічны даследчы цэнтр студэнцкага гарадка БДУ знаходзіцца па адрасе: вул. Кастрычніцкая, 4, каб. 106. Працуе з 9.00 да 17.00 штодзённа, акрамя суботы і нядзелі.

Дарэчы, з 27 верасня да 1 кастрычніка кожны дзень з 18.00 да 20.00 на базе СПДЦ працуе тэлефон даверу. Вы можаце атрымаць кансультацыю па псіхалагічнай праблеме, а таксама інфармацыю пра студэнцкае жыццё. Нумар тэлефона даверу: 227-55-26.

*Наталля ДАНІЛАВА,*
*псіхолаг СПДЦ*
*студэнцкага гарадка БДУ*

У КАМЕННЫМ ЦАРСТВЕ

# Сімвал нябеснага купала

Паспрабуйце ў вераснёўскі ясны дзянёк агледзець краявіды наваколля і адзначыць багацце фарбаў прыроды. Якіх колераў толькі няма, і яны вельмі выразныя. Здаецца, што ў гэтым месяцы прырода дорыць самую цудоўную сінечу неба, мора, нават вочы ў дзяўчат выпраменьваюць незвычайнае сіняе ззянне. Не адзін раз я заўважала незвычайную сінечу нашых беларускіх азёр, нават невялічкія вадаёмы ў першы месяц восені прыгожа адлюстроўваюць блакітнае неба. Пэўна, нездарма сіні сапфір лічыцца шчаслівым каменем месяца, гэтая сувязь паміж каштоўнымі камянямі і прыродай адчуваецца добра.



Сафі Ларэн

Сапфір з'яўляецца каштоўным каменем першай катэгорыі — разнавіднасцю высакароднага карунду. Слова "сапфір" мае грэчаскае паходжанне і азначае "блакітны, сіні камень". Мінерал атрымаў назву па востраве Сапфірын, што ў Аравійскім моры. Гэта самы дарагі і прыгожы з сініх камянёў. Ён вядомы людзям з глыбокай даўніны. У прыродзе сустракаецца не часта.

Сапфіры яшчэ называюць зорнымі камянямі, таму што пасля паліроўкі кабашонаў у многіх яскрава праяўляецца светлая ззяючая зорачка. Да нас часта звяртаюцца з пытаннем, адкуль гэты цуд? Паспрабуем папулярна патлумачыць. Па-першае, трэба знайсці такі сапфір, у якім ёсць уключэнні другога мінералу, часцей — рутылу. Каб ззяла зорачка, трэба правільна апрацаваць камень. Мінерал рутыл выдзяляецца алмазным бляскам і арыенціроўкай крышталёў пад вуглом 120. Такая з'ява называецца астэрызмам (астра — зорка). А калі ўрослыя крышталікі размеркаваны ў адным напрамку, тады светлавая палосачка адна, але яна мае ўласцівасць перабягаць услед за святлом, і такія камяні называюць "кашэчым вокам".

У амерыканскім Музеі натуральнай гісторыі (Вашынгтон) знаходзіцца зорны сапфір "Зорка Індыі" вагой 536 каратаў і "Паўночная зорка" — 116 каратаў. У гэтым жа музеі захоўваюцца выразаныя партрэты прэзідэнта А. Лінкальна з сапфіру ў 2302 каратаў, з каменю 1997 каратаў — Дж. Вашынгтона, а з крышталю ў 2097 каратаў — Д. Эйзенхаўэра. Найбагацейшая калекцыя сапфіраў і вырабаў з іх знаходзіцца ў Расіі. У Маскве ў Аружэйнай палаце захоўваецца, напрыклад, залатая сякера, падараваная ў 1692 годзе рускаму цару Івану Аляксеевічу персідскім шахам Сулейманам, багата ўпрыгожаная сапфірамі. Тамсама знаходзіцца карэц цара Міхаіла Фёдаравіча з трыма буйнымі сапфірамі. Аклады евангелляў, абразоў, пышных бармаў, нагрудных і напрастольных крыжоў, вянцы і інш. таксама ўпрыгожаны сінімі каштоўнымі камянямі. Сапфірамі ганарацца многія музеі Расіі. Шырока вядомы аклад евангелля, выраблены на загад Івана Жахлівага для Благавешчанскага сабора Маскоўскага Крамля, багата ўпрыгожаны сапфірамі. Такая ж густая сінеча абрамляе чаканны аклад легендарнай рублёўскай "Тройцы" — дарунак Барыса Гадунова Троіца-Сергіеваму манастыру. Многа цудоўных і каштоўных узораў знаходзіцца ў іншых краінах. Невялікі крышталік прыроднага сапфіру ёсць і ў музеі на геаграфічным факультэце, але з якога ён радовішча — невядома.



Фільм "Тытанік" абышоў усе экраны свету

Яшчэ адзін сюрпрыз падносіць нам сапфір. Справа ў тым, што сапфіры могуць быць і не толькі сінімі. Сустракаюцца і такія назвы: усходні аранжавы гіяцынт, залаціста-жоўты ўсходні тапаз, бэзавы ўсходні аметыст, усходні хрызаліт і іншыя. Усе яны маюць непасрэднае дачыненне да сапфіраў. Словы "ўсходні" для каменя ўсё адно што "экстра-клас": стагоддзямі самыя лепшыя камяні траплялі з Усходу.

Зараз на сусветным рынку вельмі многа сінтэтычных аналагаў, якія выкарыстоўваюцца не толькі як упрыгожанне, але і настойліва прарываюцца ў самыя розныя галіны прамысловасці, новыя тэхналогіі і вытворчасці. Мода на прыродныя сінія самацветы па-ранейшаму не праходзіць, і цэны на іх застаюцца вельмі высокімі.



Эгрэт "Фантан", завушніцы ў выглядзе каскада. 1750 г.

Лепшыя сапфіры здабываюць у Індыі, Шры-Ланцы і Аўстраліі. Зараз аўстралійская здабыча складае каля 80 % сусветнай. Надзвычайна прыгожыя сапфіры знойдзены ў апошні час на радовішчы Чынтабуры ў Таіландзе. Зрэдку сустракаюцца сапфіры ў ЗША і Расіі (Урал, Хібіны).

Раней сапфір лічылі каменем сузірання, роздуму, сімвалам нябеснага купала. Сапраўды, сапфіры ніколі не выходзяць з моды. У 60-я імі вызначалася прызнаная прыгажуня, кумір пакалення — Сафі Ларэн. У нашыя дні ювеліры знакамітай фірмы "Asprey" распрацавалі для гераіні Кейт Уінслет з фільма "Тытанік" дызайн кулона "Сэрца мора". І дзякуючы гэтаму фільму сапфір, камень мудрасці, стаў сімвалам вечнага кахання.

І напрыканцы некалькі слоў хочацца сказаць пра знакамітага філосафа, мастака, творцу, самотніка, які жыў у далёкай Індыі ля падножжа Гімалаяў. Аднойчы, вандруючы па беразе ракі Іравадзі, ён знайшоў у жвіры цудоўны сапфір, які яму вельмі спадабаўся і зачараваў сваім колерам. Потым камень быў апраўлены ў сціплы пярсцёнак, з якім мастак не расставаўся ўсё жыццё. Звалі гэтага шчасліўца Святаслаў Мікалаевіч Рэрых. Можа, у такіх рэдкіх знаходках змяшчаецца нейкі знак лёсу? Можа быць...

*Валянціна СМАЛЯКОВА,*
*геолаг музея землязнаўства БДУ*


**БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ**

Заснавальнік газеты — БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

*Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 28 чэрвеня 1996 года.*

*Газета надрукавана ў Выдавецкім цэнтры Белдзяржуніверсітэта 220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6*
*Ум. друк. арк. 1*
*Падпісана да друку ў 12.00*

*30 верасня*
*Зак. 693.*
*Т. 1000 экз.*

*Адрас рэдакцыі: 220080, Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 7, паверх 4, пакой 411, тэлефон 2206827.*

**Рэдактар Т. М. КАЗАК**

*Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР*

Камп'ютэрная вёрстка П. Крышаловіча